ІНСТЫТУТ ПАЛІТЫЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ



ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА

Palitsfera Working Papers No. 7/2026

ПА ДРУГІ БОК МЯЖЫ

Беларусь і беларусы ва ўспрыманні літоўскага грамадства

Palitsfera Working Papers No. 7/2026

Па другі бок мяжы

Беларусь і беларусы ва ўспрыманні літоўскага грамадства

Арцём Семеж
Андрэй Казакевіч, PhD у галіне палітычных навук

Інстытут палітычных даследаванняў «Палітычная сфера»

Рэзюмэ

Беларуска-літоўскія адносіны за апошняе дзесяцігоддзе зведалі істотную трансфармацыю — ад прагматычнага суседскага ўзаемадзеяння да глыбокага палітычнага крызісу. Палітычны крызіс у Беларусі пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 года, актыўная падтрымка літоўскімі ўладамі беларускіх дэмакратычных сіл, рост беларускай міграцыі ў Літву, узмацненне рэгіянальных выклікаў бяспекі, а таксама падтрымка Мінскам расійскай вайны супраць Украіны сфарміравалі новы кантэкст успрымання Беларусі і беларусаў у літоўскім грамадстве.

У гэтых умовах вывучэнне грамадскай думкі дазваляе вызначыць, якім чынам жыхары Літвы ўспрымаюць Беларусь і беларусаў, а таксама наколькі выразна яны адрозніваюць беларускае грамадства, афіцыйны Мінск і дэмакратычныя сілы. Асаблівая ўвага ў даследаванні ўдзяляецца ўспрыманню Беларусі і беларускіх грамадзян у кантэксце нацыянальнай бяспекі, ацэнцы эканамічнага ўкладу беларускіх грамадзян і працоўнай міграцыі, а таксама чаканням ад палітыкі Літвы ў дачыненні да афіцыйнага Мінска і беларускай дэмакратычнай апазіцыі. Асобны блок прысвечаны гістарычнай памяці і ўспрыманню агульнай спадчыны Вялікага Княства Літоўскага, гістарычнай сімволікі, дыскусій вакол «літвінізму», а таксама ўзроўню знаёмства літоўскага грамадства з беларускімі культурнымі і гістарычнымі дзеячамі.

Такім чынам, даследаванне накіравана на выяўленне асноўных тэндэнцый, супярэчнасцяў і праблемных аспектаў стаўлення жыхароў Літвы да Беларусі і беларусаў. Вынікі дазваляюць лепш зразумець сучасны стан грамадскага ўспрымання беларуска-літоўскіх адносін, а таксама фактары, якія могуць уплываць на іх далейшае развіццё.

Даследаванне распрацавана і праведзена Інстытутам палітычных даследаванняў “Палітычная сфера” ў супрацоўніцтве з Vytautas Magnus University (Kaunas, Lithuania), а палявы этап быў праведзены літоўскай кампаніяй па даследаванні рынку і грамадскай думкі “Spinter tyrimai”.[1]

Методыка. Даследаванне праводзілася з выкарыстаннем камбінаванага метаду апытання: Computer Assisted WEB Interview (CAWI) і Computer Assisted Telephone Interview (CATI).[2] Апытанне было праведзена ў два этапы: 19–29 студзеня і 19–27 лютага 2026 года на ўсёй тэрыторыі Літоўскай Рэспублікі. У даследаванні прынялі ўдзел жыхары Літвы ва ўзросце ад 18 да 75 гадоў. Агульная выбарка склала 1017

[1] Кампанія па даследаванні рынку і грамадскай думкі “Spinter tyrimai” была заснавана ў 1996 годзе. Крыніца: https://spinter.lt/

[2] У агульнай структуры выбаркі 70% рэспандэнтаў былі апытаныя метадам CAWI, а 30% — метадам CATI.

рэспандэнтаў, што дазваляе зрабіць выснову аб рэпрэзентатыўнасці атрыманых даных.[3] Адбор удзельнікаў ажыццяўляўся метадам квотнай выбаркі. Максімальная статыстычная хібнасць выбаркі складае прыблізна ±3,1%.

Для аналізу вынікаў выкарыстоўваліся асноўныя сацыяльна-дэмаграфічныя характарыстыкі рэспандэнтаў, якія дазваляюць выявіць адрозненні паміж асобнымі групамі насельніцтва. Вынікі супастаўляліся паводле полу, узросту, узроўню адукацыі, узроўню даходу, сямейнага становішча, рэгіёна і тыпу населенага пункта пражывання. Дадаткова ўлічваліся палітычныя перавагі рэспандэнтаў і наяўнасць асабістых сувязяў з Беларуссю і беларусамі. Такі падыход дазваляе вызначыць, якія сацыяльныя, эканамічныя і палітычныя характарыстыкі звязаны з адрозненнямі ва ўспрыманні Беларусі, беларускіх грамадзян і асобных аспектаў беларуска-літоўскіх адносін.

Стаўленне да беларусаў

Агульнае меркаванне. У цэлым станоўчае стаўленне жыхароў Літвы да грамадзян Беларусі выказваюць 9,4% рэспандэнтаў і 27,7% — хутчэй станоўчае. Негатыўнае меркаванне ў дачыненні да грамадзян Беларусі адзначаюць 12,9% удзельнікаў апытання і хутчэй адмоўнае стаўленне — 23,7% апытаных. У той жа час чвэрць апытаных (26,3%) не змаглі адказаць. Такім чынам, грамадская думка грамадзян Літвы ў дачыненні да беларусаў падзелена пароўну: 37,1% пазітыўна і 36,6% негатыўна. Пры гэтым значная доля тых, хто не змог адказаць, можа сведчыць пра неадназначнасць тэмы або асцярожнасць у выказванні пазіцыі.

Адрозненні ў стаўленні да беларусаў асабліва прыкметныя паміж асобнымі ўзроставымі і сацыяльнымі групамі, а таксама сярод прыхільнікаў розных палітычных сіл. Найбольш крытычна настроеныя рэспандэнты 26–35 гадоў: 45,1% выказваюць негатыўнае стаўленне да беларусаў, тады як станоўчае — 25,1%. Добразычлівае стаўленне характэрна для груп 46–55 гадоў (44,6% станоўчых ацэнак) і 56 гадоў і старэйшых (41,2%). Негатыўныя ацэнкі таксама часцей сустракаюцца сярод рэспандэнтаў з вышэйшай адукацыяй (40,4%) і асабліва сярод найбольш забяспечанай групы з даходам звыш 1500 еўра (48%).[4] Істотныя адрозненні прасочваюцца і паводле палітычных пераваг. Сярод выбаршчыкаў Lietuvos valstiečių ir žaliųjų sąjungą станоўча або хутчэй станоўча беларусаў ацэньваюць 54,7%, партыі Nemuno aušra — 49,3%, тады як сярод прыхільнікаў Demokratų sąjungą "Vardan Lietuvos" доля негатыўных ацэнак дасягае 46%, а сярод Tėvynės sąjungą – Lietuvos Konservatorius — 43,8%.

[3] Абедзве выбаркі ўключалі па 1017 рэспандэнтаў.
[4] Падобныя адрозненні прысутнічаюць у грамадскай думцы грамадзян Латвіі і Украіны.

Для параўнання, сярод іншых даследаванняў Інстытута “Палітычная сфера”, праведзеных у памежных краінах, у Латвіі пазітыўнае стаўленне да грамадзян Беларусі выказваюць 50,4% і 25,3% — негатыўнае; у Польшчы пазітыўная ацэнка склала 49,8%, негатыўная — 17,6%, а ва Украіне ўпершыню з пачатку вайны стаўленне да грамадзян Беларусі ў 2026-м палепшылася і склала 44,5 працэнтнага пункта, а негатыўную ацэнку выказалі 36,1%.[5]



Іл. 1. Стаўленне да беларусаў (грамадзян Беларусі)

Такім чынам, сярод разгледжаных краін-суседзяў у Літве назіраюцца найбольш стрыманыя ацэнкі ў дачыненні да грамадзян Беларусі. Узровень пазітыўнага стаўлення з’яўляецца самым нізкім, тады як доля негатыўных ацэнак — адной з найвышэйшых.

Стаўленне да грамадзян Беларусі, якія пражываюць у Літве. Даследаванне выявіла, што беларускія грамадзяне, якія пражываюць у Літве, часцей цэняцца рэспандэнтамі. Знаходжанне беларусаў у Літве станоўча адзначылі 9,2% апытаных і хутчэй станоўча — 32,6%. Негатыўна пра знаходжанне беларускіх грамадзян на тэрыторыі Літвы выказаліся 9,1%, і 21,7% ацэньваюць яго як хутчэй негатыўнае. Яшчэ 27,2% рэспандэнтаў не змаглі адказаць. Такім чынам, стаўленне да грамадзян Беларусі, якія пражываюць на тэрыторыі Літвы, можна ахарактарызаваць як хутчэй пазітыўнае (41,8%), чым негатыўнае (30,8%).

[5] Dmitrijs Borjajevs, Yury Lytko, and Andrei Kazakevich, *Strangers Next Door: Belarus and Belarusians in Latvian Public Opinion*, Palitsfera Working Papers No. 4/2026 (Institute of Political Studies “Political Sphere,” 2026), 10-11.



Іл. 2. Стаўленне да грамадзян Беларусі, якія пражываюць у краіне

У суседніх краінах становішча грамадзян Беларусі, якія там пражываюць, выглядае інакш. Так, напрыклад, у Польшчы 55,7% апытаных пазітыўна ацэньваюць беларускіх грамадзян, якія там знаходзяцца, і 16,5% — негатыўна; ва Украіне пазітыўнае стаўленне да беларусаў, якія там пражываюць, выказалі 78%, а 4,18% — негатыўнае.

Стаўленне да беларусаў, якія пражываюць у Літве, адрозніваецца паміж асобнымі групамі насельніцтва. Найбольш крытычна настроены рэспандэнты 26–35 гадоў, больш станоўча беларусаў ацэньваюць 33,5%, тады як адмоўна — 36,1%. Сярод рэспандэнтаў з вышэйшай адукацыяй доля станоўчых ацэнак таксама ніжэйшая — 36,2% і 45,1% сярод тых, хто мае сярэднюю адукацыю. У той жа час жыхары буйных гарадоў ставяцца да беларусаў крыху больш стрымана: станоўчую ацэнку даюць 37,8%, 45,6% сярод жыхароў раённых цэнтраў і 44,9% у сельскай мясцовасці. Больш значныя адрозненні праяўляюцца ў залежнасці ад палітычных пераваг: сярод электарату Lietuvos valstiečių ir žaliųjų sąjungą станоўча ацэньваюць беларусаў, якія пражываюць у Літве, 56,2%, сярод партыі Socialdemokratų — 48,9%, тады як сярод прыхільнікаў Tėvynės sąjungą – Lietuvos Konservatorius гэты паказчык складае 34,7%, а сярод выбаршчыкаў Demokratų sąjungą “Vardan Lietuvos” — 39,2%.


У цэлым стаўленне да беларускай дыяспары за мяжой спрыяльнае, аднак у Літве яно прыкметна больш стрыманае, чым у Польшчы і асабліва ва Украіне. Гэта сведчыць пра тое, што ў вачах літоўскага грамадства беларуская міграцыя ўспрымаецца трохі інакш, чым беларускія грамадзяне ў цэлым.

Беларуская міграцыя ў 2020-м. У 2020 годзе, калі ў Беларусі пачаліся пратэсты супраць меркаваных фальсіфікацый на выбарах, урад Літвы дазволіў уезд у краіну многім людзям, вымушаным пакінуць Беларусь. На пытанне "Як вы ацэньваеце гэтае рашэнне?" 12,9% адказалі, што рашэнне літоўскага ўрада было правільным, а 37% ацэньваюць рашэнне як хутчэй правільнае. У той жа час катэгарычна няправільным прыняцце рашэння афіцыйнага Вільнюса лічаць 8,7% і хутчэй няправільным — 18,5% апытаных, а 23% не змаглі адказаць. Такім чынам, палова ўдзельнікаў апытання (49,9%) падтрымліваюць рашэнне ўрада ў 2020-м аб адкрыцці межаў для беларускіх грамадзян, і 27,2% ацэньваюць рашэнне менш станоўча.

Для параўнання, у суседняй Польшчы 59,3% апытаных ацэньваюць як правільнае рашэнне польскага ўрада дазволіць уезд, а 19,8% выказваюць больш негатыўную ацэнку.

У ацэнцы рашэння літоўскіх улад 2020 года найбольш выразныя адрозненні звязаны з узроўнем даходу. Сярод рэспандэнтаў з высокім даходам (больш за 1500 еўра) рашэнне падтрымліваюць 61,6%, тады як сярод тых, хто атрымлівае да 500 еўра, — 43,6%. Крыху вышэйшая падтрымка і сярод рэспандэнтаў з вышэйшай адукацыяй (52,3%). Пэўная дынаміка назіраецца і паводле палітычных пераваг. Станоўча рашэнне ацэньваюць 56,1% выбаршчыкаў Liberalų sąjūdį і 55,4% прыхільнікаў Tėvynės sąjungą – Lietuvos Konservatorius, тады як сярод электарату партыі Nemuno aušra гэты паказчык складае 45,7%, а сярод тых, хто не ўдзельнічаў у апошніх выбарах, — 43%.

Такім чынам, вынікі даследавання сведчаць пра тое, што рашэнне літоўскага ўрада 2020 года атрымала хутчэй станоўчую грамадскую ацэнку і доля тых, хто яго падтрымлівае, прыкметна перавышае долю крытычна настроеных рэспандэнтаў. Вышэйшая падтрымка сярод рэспандэнтаў з больш высокім узроўнем адукацыі можа сведчыць пра адрозненні ва ўспрыманні гуманітарных і палітычных падстаў гэтага рашэння паміж сацыяльнымі групамі. Разам з тым значная доля тых, хто не змог адказаць, сведчыць пра тое, што пытанне прыёму беларускіх грамадзян пасля 2020 года застаецца неадназначным для літоўскага грамадства.




Іл. 3. Стаўленне да беларусаў і іх прыёму ў 2020 годзе

Супастаўленне трох паказчыкаў паказвае, што стаўленне літоўскага грамадства да беларусаў залежыць ад кантэксту, у якім фармулюецца пытанне. Агульная ацэнка грамадзян Беларусі з'яўляецца найбольш стрыманай (37,2% станоўчых адказаў), тады як стаўленне да беларусаў, якія пражываюць у Літве, разглядаецца літоўскім грамадствам больш пазітыўна (41,9%). Найбольшую падтрымку атрымлівае рашэнне аб прыёме людзей, вымушаных пакінуць Беларусь пасля падзей 2020 года (49,9%). Гэта дазваляе меркаваць, што літоўскае грамадства ў пэўнай ступені размяжоўвае агульнае стаўленне да грамадзян Беларусі і ацэнку канкрэтнай групы мігрантаў, асабліва калі іх знаходжанне звязана з палітычнымі і гуманітарнымі абставінамі 2020 года.

Непасрэдны кантакт з беларусамі. Вынікі даследавання паказваюць, што інтэнсіўнасць непасрэдных кантактаў літоўцаў з беларусамі даволі нізкая. Толькі 12,4% апытаных за апошнія 12 месяцаў падтрымлівалі сувязі са сваякамі, калегамі, знаёмымі і іншымі людзьмі з Беларусі (незалежна ад таго, пражываюць яны ў Беларусі або ў іншых краінах).

Гістарычная звязанасць Вільнюса з беларускай грамадскай прасторай часткова адлюстроўваецца і ў сучасных сацыяльных кантактах. Сярод жыхароў сталіцы 21,7% маюць сваякоў, калег, знаёмых або іншых асоб з Беларусі, з якімі падтрымлівалі сувязь на працягу апошніх 12 месяцаў. У той жа час у іншых буйных гарадах — толькі 7,5%, у раённых цэнтрах — 9,8%, а ў сельскай мясцовасці — 12,1%.



Іл. 4. Кантакты з людзьмі з Беларусі за апошні год

У Латвіі каля чвэрці рэспандэнтаў (23,9%) паведамілі пра такі кантакт за апошні год; у Польшчы — 15%, а ва Украіне — 4,29%.

Такім чынам, можна зрабіць высновы пра тое, што для большасці насельніцтва Літвы ўяўленні пра Беларусь і беларусаў пераважна фарміруюцца праз медыя, а таксама палітычны парадак дня афіцыйнага Вільнюса, а не праз непасрэдныя сувязі з беларускімі грамадзянамі. Толькі кожны восьмы ўдзельнік апытання меў асабісты кантакт за апошні год, што, у сваю чаргу, сведчыць пра абмежаванае ўзаемадзеянне паміж сацыяльнымі групамі Беларусі і Літвы.

Працоўная міграцыя і эканамічны ўклад

Адказваючы на пытанне “Як Літве варта падыходзіць да пытання працоўнай міграцыі з Беларусі?”, 26,8% падтрымліваюць курс на больш абмежавальную пазіцыю і лічаць, што неабходна скараціць колькасць працоўных мігрантаў з Беларусі, якія цяпер знаходзяцца ў Літве. Яшчэ 18,1% выступаюць за спыненне далейшай працоўнай міграцыі з Беларусі, але без прыняцця захадаў для скарачэння ўжо наяўнай колькасці. Больш за траціну (37,3%) выступаюць за дазвол працоўнай міграцыі на тых жа ўмовах, што і з іншых краін, якія не ўваходзяць у ЕС. За стымуляванне працоўнай міграцыі з Беларусі выступаюць 3,9%. Дзясятая частка (13,9%) апытаных не змаглі адказаць, што сведчыць пра нявызначанасць рэспандэнтаў у пытанні беларускай працоўнай міграцыі.

Пры аб’яднанні адказаў у больш негатыўную і пазітыўную групы назіраецца роўны падзел грамадскай думкі. Больш абмежавальны падыход да працоўнай

міграцыі з Беларусі падтрымліваюць 44,9% рэспандэнтаў, тады як за захаванне дзейных умоў або стымуляванне такой міграцыі выступаюць 41,2%.

Сацыяльны разрыў зноў з'яўляецца ключавым фактарам. Меркаванне пра тое, што Літве варта імкнуцца да скарачэння колькасці працоўных мігрантаў, якія ўжо знаходзяцца ў Літве, або да спынення далейшай міграцыі, падтрымліваюць 53,9% жыхароў Вільнюса супраць 41,4% сельскіх жыхароў. Сярод рэспандэнтаў з даходам да 500 еўра такую пазіцыю займаюць 39,2%, тады як сярод тых, хто атрымлівае больш за 1500 еўра, — ужо 54,2%. Больш абмежавальны падыход таксама часцей назіраецца сярод рэспандэнтаў з вышэйшай адукацыяй (48,6%), чым сярод тых, хто мае сярэднюю (43%).

Для параўнання, у суседняй Латвіі каля 40% рэспандэнтаў займаюць абмежавальную пазіцыю, у той час як прыблізна 40% падтрымліваюць больш адкрыты падыход; у Польшчы 42,9% выступаюць за скарачэнне, 39,7% — за адкрытасць рынку працы.

Разам з тым уклад беларусаў у эканоміку Літвы ацэньваецца пераважна станоўча. На думку 39,6% удзельнікаў апытання, беларусы, якія пражываюць у Літве, робяць невялікі, але станоўчы ўклад у эканоміку краіны, яшчэ 8% лічаць гэты ўклад значным. Больш за траціну рэспандэнтаў (34,7%) мяркуюць, што беларусы не аказваюць ніякага ўплыву на літоўскую эканоміку. Невялікі негатыўны ўклад адзначаюць 11,9% апытаных, а значны негатыўны ўклад — 5,8%. Такім чынам, каля паловы (47,6%) рэспандэнтаў ацэньваюць эканамічны ўклад беларусаў станоўча, а больш за траціну (34,7%) займаюць нейтральную пазіцыю. Толькі 17,7% даюць негатыўную ацэнку. Гэта сведчыць пра тое, што ў эканамічным вымярэнні прысутнасць беларусаў у Літве ўспрымаецца хутчэй станоўча або нейтральна, тады як выразна негатыўныя ацэнкі застаюцца ў меншасці.

Узроставыя адрозненні найбольш прыкметныя паміж маладой і старэйшай групамі рэспандэнтаў. Сярод 26–35-гадовых станоўча эканамічны ўклад беларусаў ацэньваюць 38,7%, тады як сярод рэспандэнтаў, старэйшых за 56 гадоў, 55,3%. Адначасова ў групе 26–35 гадоў доля негатыўных ацэнак дасягае 21,5%, а сярод старэйшай узроставай групы — 15,9%. Паводле ўзроўню даходаў асабліва вылучаецца найбольш забяспечаная група з даходам звыш 1500 еўра: 54,8% адзначаюць станоўчы ўклад, а негатыўны — толькі 8,2%.

У Польшчы станоўчую ацэнку эканамічнаму ўкладу беларусаў даюць 42,1% рэспандэнтаў, негатыўную — 13,2%, а 24,3% не адзначаюць прыкметнага ўплыву на эканоміку краіны.

Такім чынам, пытанне працоўнай міграцыі з Беларусі застаецца адным з тых, што найбольш падзяляюць грамадскую думку. З аднаго боку, літоўскае грамадства не падтрымлівае поўнага адкрыцця рынку працы для беларускіх мігрантаў, а таксама прысутнічаюць настроі на ўвядзенне дадатковых абмежаванняў або скарачэнне патоку. З другога боку, амаль кожны другі выступае за захаванне працоўнай міграцыі на тых жа ўмовах, што і для грамадзян іншых краін па-за ЕС, або яе стымуляванне. У цэлым каля 40% рэспандэнтаў дэманструюць адносна адкрытую пазіцыю як у дачыненні да грамадзян Беларусі (у цэлым), так і ў дачыненні да беларусаў, якія пражываюць у Літве, а таксама працоўнай міграцыі. Пры гэтым станоўчая ацэнка эканамічнага ўкладу беларусаў у Літве яшчэ вышэйшая і дасягае 47,6%. Гэта сведчыць пра тое, што стаўленне да эканамічнай ролі беларусаў, якія пражываюць у Літве, больш спрыяльнае, чым стаўленне да далейшага развіцця працоўнай міграцыі.


Бяспека і ўспрыманне пагроз

Паводле даных Міграцыйнага дэпартамента Літвы ад 1 лютага 2026, у Літве пражывае каля 50 тысяч грамадзян Беларусі.[6] Такім чынам, грамадзяне Беларусі з'яўляюцца другой па колькасці групай іншаземцаў, якія маюць дазвол на пражыванне ў Літве, пасля грамадзян Украіны. На пытанне пра тое, ці нясуць грамадзяне Беларусі, якія пражываюць у Літве, пагрозу нацыянальнай бяспецы краіны, 4,2% рэспандэнтаў адказалі сцвярджальна, а яшчэ 21,2% лічаць, што такая пагроза хутчэй існуе. У той жа час 34,3% мяркуюць, што пагрозы хутчэй няма, а 14,5% цалкам яе выключаюць. Яшчэ 25,8% апытаных не змаглі адказаць.

Успрыманне беларускіх грамадзян як пагрозы нацыянальнай бяспецы найбольш прыкметна адрозніваецца ў залежнасці ад палітычных пераваг рэспандэнтаў. Асабліва вылучаюцца прыхільнікі Demokratų sąjungą "Vardan Lietuvos", бо гэта адзіная з прадстаўленых электаральных груп, дзе доля тых, хто лічыць беларусаў, якія пражываюць у краіне, пагрозай (41,9%), перавышае долю тых, хто не ўспрымае іх як пагрозу (32,5%). Сярод астатніх партый пераважае адваротная пазіцыя. Напрыклад, сярод выбаршчыкаў Tėvynės sąjungą – Lietuvos Konservatorius пагрозу бачаць 29,7%, а не бачаць 43,8%; сярод прыхільнікаў Nemuno aušra — адпаведна 27,1% і 54,3%, партыі Socialdemokratų — 22,4% і 49,5%, Liberalų sąjūdį — 20,9% і 53,9%, Lietuvos valstiečių ir žaliųjų sąjungą — 18,8% і 54,7%. Паводле ўзросту асабліва вылучаецца самая маладая група апытаных: сярод 18–25-гадовых пагрозу бачаць толькі 16,8%, тады як сярод 26–35-гадовых — 29,9%, а сярод людзей старэйшых за 56 гадоў — 28,2%. Важна адзначыць, што маладыя

[6] Migracija Lietuvoje, "IMIGRANTAI LIETUVOJE / 2026 m. vasario 1 d. duomenys" (Lithuanian Migration Department), 2026, p. 1, https://migracija.lrv.lt/public/canonical/1770372012/1522/imig-2026-02.pdf

рэспандэнты таксама часцей не могуць даць ацэнку — 32,7%. Такім чынам, амаль палова рэспандэнтаў (48,8%) хутчэй не разглядаюць грамадзян Беларусі, якія пражываюць у Літве, як пагрозу нацыянальнай бяспецы, тады як 25,4% у той ці іншай ступені такую пагрозу бачаць. Пры гэтым кожны чацвёрты рэспандэнт не змог сфарміраваць пэўную пазіцыю, што ўказвае на значную нявызначанасць грамадскай думкі ў гэтым пытанні.



Іл. 5. Ці пагражаюць беларусы ў Літве нацыянальнай бяспецы


Калі ўзяць пад увагу суседнія краіны, то ў Польшчы доля рэспандэнтаў, якія ўспрымаюць грамадзян Беларусі як пагрозу, складае 17,7%, тады як 64,8% такой пагрозы не бачаць. У Латвіі гэты разрыў яшчэ больш выразны: 8,4% і 78,1%.

Сярод рэспандэнтаў, якія ў той ці іншай ступені лічаць грамадзян Беларусі, што пражываюць у Літве, пагрозай нацыянальнай бяспецы, найбольш часта згадваецца шпіянаж з боку беларускіх спецслужбаў — 22,8%. Яшчэ 14,7% звязваюць пагрозу з палітычнай нелаяльнасцю, 12% — з магчымай унутранай дэстабілізацыяй, 11,2% — з сацыяльна-культурнымі рызыкамі, а 10,4% — з гібрыднымі пагрозамі. Радзей згадваюцца ваенныя сцэнарыі (6,2%), няпэўнасць адносна таго, “хто прыехаў” (4,2%), злачыннасць (3,5%), эканамічныя і працоўныя пагрозы (3,1%), розныя непрадбачаныя пагрозы (3,1%), кантрабанда і іншая незаконная дзейнасць (2,7%), дэмаграфічныя асцярогі, звязаныя з вялікай колькасцю беларусаў (1,5%), а таксама аўтанамісцкія ідэі (0,8%). Яшчэ 15,1% не змаглі назваць канкрэтную пагрозу, а 1,5% выбралі варыянт “іншае”.

Такім чынам, сярод рэспандэнтаў, якія ўспрымаюць грамадзян Беларусі як патэнцыйную пагрозу, дамінуюць асцярогі, звязаныя з дзейнасцю беларускіх спецслужбаў, палітычнай лаяльнасцю і магчымай унутранай дэстабілізацыяй. Пры гэтым ваенныя, крымінальныя, эканамічныя і дэмаграфічныя сцэнарыі згадваюцца прыкметна радзей.

Пагрозы з боку беларускай дзяржавы. Ацэньваючы, ці нясе цяперашняя беларуская дзяржава пагрозу для Літвы па шкале ад 1 да 10, рэспандэнты ў

сярэднім далі ацэнку 6,28 бала.[7] Пры гэтым найбольш часта выбіраліся значэнні 7 і 8 балаў — 19% і 17,1%. У сукупнасці 52,4% апытаных ацанілі пагрозу на ўзроўні 7–10 балаў, тады як нізкія ацэнкі ад 1 да 4 далі 20,6% рэспандэнтаў. Яшчэ 27% выбралі прамежкавыя значэнні 5–6 балаў.



Іл. 6. Пагроза з боку беларускай дзяржавы

Рэспандэнты з вышэйшай адукацыяй часцей ацэньваюць пагрозы вышэй: 56,2% ацэньваюць пагрозу ў 7–10 балаў і 50% сярод рэспандэнтаў з сярэдняй адукацыяй. Адрозненні прыкметныя і паводле месца жыхарства, бо ў буйных гарадах і раённых цэнтрах ацэнкі 7–10 даюць 55,2% і 55,1%, пры гэтым у сельскай мясцовасці — 45,3%. Больш наглядны прыклад назіраецца паміж электаратамі палітычных партый. Сярод выбаршчыкаў Tėvynės sąjungą – Lietuvos Konservatorius ацэнкі 7–10 адзначаюць 65,3%, сярод прыхільнікаў Liberalų sąjūdį — 63,8%. У той жа час сярод выбаршчыкаў Lietuvos valstiečių ir žaliųjų sąjungą падобную пагрозу вылучаюць 36%, а партыі Nemuno aušra — 40,8%. Такім чынам, успрыманне Беларусі як пагрозы ў значнай ступені звязана і з палітычнымі арыентацыямі рэспандэнтаў.


У суседняй Латвіі сярэдняя ацэнка пагрозы з боку беларускай дзяржавы склала 4,55 бала, а ў Польшчы — 5,3 з 10.

[7] Ацэнка праводзілася па шкале ад 1 да 10, дзе 1 азначае поўную адсутнасць пагрозы, а 10 — максімальна высокі ўзровень пагрозы.

Такім чынам, у грамадскай думцы жыхароў Літвы ўспрыманне цяперашняй беларускай дзяржавы як значнай пагрозы для Літвы пераважае ў большай ступені, чым у жыхароў Латвіі і Польшчы. Пры гэтым прыкметная доля літоўцаў займае больш памяркоўную пазіцыю, а ацэнкі застаюцца адносна аднароднымі паміж узроставымі групамі (6,01–6,54 бала), тады як у Латвіі назіраюцца значна больш выразныя ўзроставыя адрозненні.

Беларуская палітыка і дзяржава

Пры ацэнцы палітычнай сістэмы сучаснай Беларусі абсалютная большасць літоўцаў (54%) характарызуюць Беларусь як аўтарытарную дзяржаву і 21,9% — як пераважна аўтарытарную, а не дэмакратычную. Толькі 6,8% літоўцаў у той ці іншай ступені ўспрымаюць Беларусь як дэмакратычную дзяржаву. Яшчэ 17,3% апытаных не змаглі адказаць, што сведчыць пра недастаткова сфарміраванае меркаванне пра палітычны рэжым Беларусі. У грамадскай думцы Літвы дамінуе ўяўленне пра Беларусь як пра краіну, у якой пераважае аўтарытарны рэжым (75,9%). Аднак супастаўленне Беларусі з дэмакратычнай дзяржавай схільныя падтрымліваць толькі 6,8% апытаных.




Іл. 7. Палітычная сістэма Беларусі

Такім чынам, вачыма жыхароў Літвы Беларусь устойліва ўспрымаецца як аўтарытарная дзяржава. Аўтарытарны характар адзначаюць рэспандэнты з вышэйшай адукацыяй (65%), а найбольш эканамічна ўстойлівыя, з даходам больш за 1500 еўра, непасрэдна называюць Беларусь аўтарытарнай (74,5%), тады як сярод эканамічна ўразлівых рэспандэнтаў (да 500 еўра) — 41,6%. Жыхары сталіцы ў абсалютнай большасці (65%) называюць Беларусь аўтарытарнай, а ў сельскай мясцовасці — 46,8%. Пры гэтым асабістыя сувязі з Беларуссю нязначна

змякчаюць успрыманне: сярод тых, хто мае такія кантакты, адназначна аўтарытарнай краіну лічаць 45,2%, тады як сярод тых, хто не мае, — 55,2%.

Статус беларускай дзяржавы. З 2020 года ў літоўскай інфармацыйнай і інстытуцыянальнай прасторы прыкметна ўзмацніўся наратыў пра абмежаваную самастойнасць Беларусі і ўзрастанне яе залежнасці ад Расіі. Паказальным прыкладам стала прынятая Сеймам Літоўскай Рэспублікі 10 верасня 2020 года рэзалюцыя "Аб незаконным і навязаным Беларусі саюзе з Расіяй", у якой далейшае паглыбленне беларуска-расійскай інтэграцыі разглядалася як пагроза суверэнітэту Беларусі і фактычна як магчымая "de facto анексія краіны".[8]

Меркаванне літоўцаў адносна знешнепалітычнага становішча Беларусі можна лічыць гэтак жа кансалідаваным. Абсалютная большасць — 62% ацэньвае высокую залежнасць краіны ад Расіі. Каля чвэрці (22,9%) лічаць Беларусь залежнай дзяржавай, якая знаходзіцца пад поўным кантролем Расіі, а 11% разглядаюць яе як краіну, фактычна акупаваную Крамлём. Яшчэ 28,1% мяркуюць, што, хоць пэўная аўтаномія захоўваецца, замежную палітыку Беларусі ўсё ж "амаль цалкам" вызначае Масква.



Іл. 8. Беларусь: залежная ці незалежная дзяржава?

У Польшчы і ва Украіне Беларусь часцей успрымаецца як залежная дзяржава — 69,4% і 71,5%, тады як незалежнай яе лічаць 19,1% і 22,9%. У Латвіі суадносіны іншыя: 49,4% называюць Беларусь залежнай і 36,7% — незалежнай.

Успрыманне залежнасці Беларусі ад Расіі прыкметна адрозніваецца паміж асобнымі сацыяльна-эканамічнымі групамі. Ацэнкі залежнасці характэрны для рэспандэнтаў з вышэйшай адукацыяй і найбольш высокім узроўнем даходу. Калі

[8] Lietuvos Respublikos Seimas, "Rezoliucija dėl neteisėtos ir Baltarusijai Rusijos primetamos sąjungos," September 10, 2020, https://e-seimas.lrs.lt/portal/legalAct/lt/TAD/a7825340f3f311eab72ddb4a109da1b5

аб'яднаць адказы аб практычна поўным вызначэнні замежнай палітыкі Беларусі Расіяй, поўным расійскім кантролі і фактычнай акупацыі, іх выбіраюць 71,3% рэспандэнтаў з вышэйшай адукацыяй і 79,5% рэспандэнтаў з самым высокім даходам. У той жа час сярод тых, хто мае сярэднюю адукацыю, гэты паказчык складае 56,7%, а сярод рэспандэнтаў з мінімальным даходам — 53,1%.

Як ужо згадвалася раней, палітычныя перавагі больш наглядна размяркоўваюць успрыманне беларускай замежнай палітыкі. Успрыманне Беларусі як залежнай, цалкам кантраляванай або фактычна акупаванай Расіяй дзяржавы найбольш распаўсюджана сярод выбаршчыкаў Tėvynės sąjungą – Lietuvos Konservatorius (77,7%) і Liberalų sąjūdį (73,6%). У той жа час сярод прыхільнікаў Nemuno aušra доля тых, хто лічыць Беларусь незалежнай дзяржавай, дасягае 34,6%, што з'яўляецца адным з найбольш высокіх паказчыкаў сярод асноўных палітычных груп.

Тым не менш амаль чвэрць (23,8%) апытаных у той ці іншай ступені лічаць Беларусь незалежнай дзяржавай. Такім чынам, вачыма літоўскага грамадства беларуская дзяржава ўспрымаецца як палітычна несамастойны актар.

Легітымнасць Аляксандра Лукашэнкі. Адказваючы на пытанне "Ці з'яўляецца Аляксандр Лукашэнка легітымным лідарам Беларусі (які выказвае волю народа)?", большасць апытаных адзначылі, што не лічаць цяперашняга кіраўніка Беларусі легітымным прадстаўніком народнай волі. Больш за траціну (39,5%) адназначна адмаўляюць яго легітымнасць, яшчэ 23,2% схіляюцца да такой ацэнкі. У той жа час 4,3% лічаць Аляксандра Лукашэнку легітымным кіраўніком, а 15% — хутчэй легітымным. Яшчэ 17,9% не змаглі адказаць.

Сацыяльна-дэмаграфічныя адрозненні ў ацэнцы легітымнасці Аляксандра Лукашэнкі ў цэлым выяўляюцца ўмерана, аднак сярод тых, хто мае вышэйшую адукацыю, 69% не лічаць Лукашэнку легітымным кіраўніком Беларусі, тады як сярод рэспандэнтаў з сярэдняй адукацыяй такіх 59,1%. Асабліва прыкметныя адрозненні паводле ўзроўню даходу: сярод рэспандэнтаў з высокім узроўнем дабрабыту доля тых, хто не прызнае яго легітымнасць, дасягае 80,8%, у той час як іншыя ўзроўні знаходзяцца прыблізна ў адным дыяпазоне непрызнання, 60–66%. Палітычныя перавагі прыкметна звязаны з ацэнкай легітымнасці Аляксандра Лукашэнкі. Найбольш высокая доля тых, хто ў цэлым прызнае яго легітымнасць, назіраецца сярод выбаршчыкаў Nemuno aušra (30,8%) і Lietuvos valstiečių ir žaliųjų sąjungą (26,6%), тады як непрызнанне характэрна для прыхільнікаў Tėvynės sąjungą – Lietuvos Konservatorius (77,7%) і Liberalų sąjūdį (74,7%).

У сукупнасці 62,7% апытаных не прызнаюць легітымнасці Аляксандра Лукашэнкі, тады як супрацьлеглай пазіцыі прытрымліваюцца 19,3%. Такім чынам, у грамадскай думцы Літвы больш як у тры разы пераважае доля тых, хто не

прызнае легітымнасці цяперашняга кіраўніка Беларусі. Пры гэтым пятая частка тых, хто не вызначыўся, паказвае, што пытанне легітымнасці застаецца неадназначным для часткі грамадства.

Пазнавальнасць Святланы Ціханоўскай. Што тычыцца альтэрнатыўных беларускіх палітычных сіл, назіраецца адваротная тэндэнцыя. На пытанне "Ці ведаеце вы Святлану Ціханоўскую — лідара беларускай дэмакратычнай апазіцыі, якая балатавалася супраць Аляксандра Лукашэнкі на выбарах 2020 года?" амаль тры чвэрці рэспандэнтаў (74,4%) адказалі сцвярджальна. У той жа час 14,9% не ведаюць і/або не чулі пра яе. Яшчэ 10,6% не змаглі адказаць.

Сацыяльна-дэмаграфічныя адрозненні невялікія, аднак крыху часцей лідарку беларускай апазіцыі ведаюць старэйшыя і найбольш забяспечаныя рэспандэнты. Сярод асоб, старэйшых за 56 гадоў, паказчык пазнавальнасці дасягае 79,6%, а сярод тых, хто атрымлівае найвышэйшы даход, — 84,9%, тады як сярод рэспандэнтаў з мінімальным даходам (да 500 еўра) — 67,8%. Крыху нечакана тое, што пазнавальнасць Святланы Ціханоўскай вышэйшая сярод жыхароў сельскай мясцовасці (79,2%), чым буйных гарадоў (70,9%) або раённых цэнтраў (75,5%). Аднак такія адрозненні перш за ўсё звязаны з асаблівасцямі ўзроставай структуры гэтых груп, бо Ціханоўскую часцей ведаюць рэспандэнты старэйшага ўзросту, ад 56 гадоў (79,6%), а сярод 26–45-гадовых такіх 69,1–69,4%.

Такім чынам, Святлана Ціханоўская мае вельмі высокі паказчык пазнавальнасці ў літоўскім грамадстве з такіх прычын, як фізічная прысутнасць і ажыццяўленне актыўнасці ў Вільнюсе, а таксама таму, што яе постаць шырока прадстаўлена ў інфармацыйнай прасторы Літвы.

Чаканні ад палітыкі Літвы ў дачыненні да Беларусі

Асобны блок пытанняў датычыўся палітыкі, якую афіцыйнаму Вільнюсу варта праводзіць у дачыненні да беларускіх улад і альтэрнатыўных палітычных сіл.

Каля траціны (30%) рашуча настроены на знешнепалітычную ізаляцыю і санкцыі ў дачыненні да Беларусі. Яшчэ 39,9% лічаць, што Літве варта захоўваць адносіны, але толькі ў выгадных сектарах, такіх як эканамічныя. Актыўнае супрацоўніцтва і партнёрства з Мінскам падтрымліваюць 13,2% рэспандэнтаў, а 16,9% не змаглі адказаць.

Аналіз таксама выявіў сацыяльна-эканамічныя тэндэнцыі адносна пераваг у палітыцы Літвы ў дачыненні да Беларусі. Чым вышэйшы ўзровень даходу, тым часцей падтрымліваецца палітыка ізаляцыі і санкцый: сярод рэспандэнтаў з мінімальным даходам (да 500 еўра) пазіцыі жорсткай сілы прытрымліваюцца

18,4%, тады як у групе з найвышэйшым узроўнем дабрабыту такіх 51,1%. Адначасова падтрымка абмежаванага прагматычнага ўзаемадзеяння з беларускімі ўладамі зніжаецца з 48% да 31,9%, а паўнавартаснага супрацоўніцтва — з 18,4% да 8,5%. Падобнае адрозненне назіраецца паводле ўзроўню адукацыі, бо сярод рэспандэнтаў з вышэйшай адукацыяй ізаляцыю і санкцыі падтрымліваюць 38,3%, тады як сярод тых, хто мае сярэднюю, толькі 24,5%. Падтрымка ізаляцыі і санкцый найвышэйшая сярод жыхароў Вільнюса — 41,9%, у іншых буйных гарадах і раённых цэнтрах яе падтрымліваюць каля 28–30%, а ў сельскай мясцовасці — 22,5%. Пры гэтым наяўнасць асабістых кантактаў з беларусамі звязана з больш адкрытым стаўленнем да супрацоўніцтва — 23% выступаюць за развіццё паўнавартаснага супрацоўніцтва з беларускімі ўладамі, тады як сярод тых, хто не мае такіх сувязяў, толькі 11,8%.

Сярод суседніх краін найбольш распаўсюджанай таксама застаецца пазіцыя абмежаванага прагматычнага ўзаемадзеяння з беларускімі ўладамі: яе падтрымліваюць 44,9% рэспандэнтаў у Польшчы, 45,8% ва Украіне і 28,8% у Латвіі. Пры гэтым санкцыйна-ізаляцыйны падыход прыкметна мацней выяўляецца ў Латвіі (33,5%), чым у Польшчы (20,7%) і ва Украіне (17,6%), тады як актыўнае супрацоўніцтва ва ўсіх краінах застаецца менш пашыранай пазіцыяй.

Такім чынам, літоўскае грамадства дэманструе хутчэй негатоўнасць да нармалізацыі двухбаковых адносін. Амаль траціна падтрымлівае прынцыповую пазіцыю, заснаваную на палітычным ціску і дыстанцыяванні ад беларускага рэжыму. Пэўна, гэта тлумачыцца такімі фактарамі, як цвёрдая інстытуцыянальная пазіцыя літоўскага ўрада ў дачыненні да Мінска, а таксама геапалітычная турбулентнасць, якая ідзе з беларускага боку і правакуе пагрозы бяспецы як для Літвы, так і ўсяго рэгіёна. Пры гэтым распаўсюджанай з'яўляецца пазіцыя асцярожнага прагматызму і абмежаванай камунікацыі, калі гэта прыносіць практычную карысць Літве.

Узаемадзеянне з беларускай дэмакратычнай апазіцыяй. Вынікі даследавання паказваюць, што 22% рэспандэнтаў выступаюць за ўсебаковае супрацоўніцтва з дэмакратычнай апазіцыяй і яе падтрымку на афіцыйным узроўні. Каля траціны апытаных (31,5%) лічаць, што Літве варта абмежавацца афіцыйнымі сустрэчамі, заявамі і іншымі формамі ўзаемадзеяння. Яшчэ 13,1% аддаюць перавагу неафіцыйнаму і непублічнаму супрацоўніцтву, тады як 10,1% выступаюць супраць развіцця якіх-небудзь кантактаў з дэмакратычнай апазіцыяй. Не змаглі адказаць 23,3%, што можа сведчыць пра слабае разуменне і значэнне беларускай апазіцыі для літоўскай грамадскасці.



Іл. 9. Палітыка Літвы ў дачыненні да беларускай дэмакратычнай апазіцыі

Найбольш прыкметнае адрозненне звязана з асабістымі кантактамі з Беларуссю. Сярод рэспандэнтаў, якія маюць кантакты з Беларуссю і беларусамі, 32,5% выступаюць за адкрытае ўсебаковае супрацоўніцтва з дэмакратычнай апазіцыяй і яе падтрымку на афіцыйным узроўні, тады як сярод тых, хто не мае такіх сувязяў, такіх 20,5%. У цэлым тую ці іншую форму супрацоўніцтва падтрымліваюць 74,6% тых, хто мае асабістыя сувязі, і 65,4% тых, хто іх не мае. З узростам трохі ўзрастае падтрымка адкрытага ўсебаковага супрацоўніцтва: калі сярод 18–25-гадовых такую пазіцыю выказваюць 15,6%, то сярод рэспандэнтаў ад 56 гадоў доля складае 25,4%.

Сярод тых, хто выступае супраць супрацоўніцтва з беларускай дэмакратычнай апазіцыяй, асноўным матывам з'яўляюцца сумненні ў яе самастойнасці: 46,6% адзначаюць нявызначанасць адносна ступені ўплыву Расіі на беларускія дэмакратычныя сілы. Яшчэ 34% звязваюць сваю пазіцыю са слабасцю апазіцыі і адсутнасцю ў яе рэальнага ўплыву на палітычныя працэсы. Для 15,5% прычынай адмовы ад супрацоўніцтва з'яўляецца асцярога, што такія кантакты могуць выклікаць негатыўную рэакцыю беларускіх улад і ўскладніць двухбаковыя адносіны, а 3,9% не змаглі адказаць.

Важна адзначыць, што рэспандэнты, якія маюць асабістыя сувязі з Беларуссю, выступаюць як за больш адкрытыя адносіны з афіцыйным Мінскам, так і з дэмакратычнай апазіцыяй. Падобна, непасрэдныя сувязі з Беларуссю спрыяюць больш дыферэнцыяванаму ўспрыманню краіны і большай зацікаўленасці ў захаванні розных каналаў узаемадзеяння.

Такім чынам, дзве траціны рэспандэнтаў (66,6%) падтрымліваюць тую ці іншую форму ўзаемадзеяння з беларускай дэмакратычнай апазіцыяй, тады як поўную

адмову ад супрацоўніцтва падтрымлівае толькі кожны дзясяты. Аднак грамадская думка ў большай ступені схіляецца да памяркоўных фарматаў узаемадзеяння, чым да паўнавартаснай афіцыйнай падтрымкі і ўсебаковага партнёрства. Негатыўнае стаўленне да супрацоўніцтва звязана перш за ўсё з сумненнямі ў яе палітычнай самастойнасці і здольнасці рэальна ўплываць на сітуацыю ў Беларусі. Пры гэтым асцярогі магчымага пагаршэння адносін з афіцыйным Мінскам адыгрываюць прыкметна меншую ролю і не з'яўляюцца дамінуючым матывам у грамадскай думцы Літвы.

Гісторыя, культура і ідэнтычнасць

Гістарычная спадчына Вялікага Княства Літоўскага застаецца важнай часткай агульнай мінуўшчыны Беларусі і Літвы і адначасова адным з найбольш адчувальных элементаў сучаснай гістарычнай памяці двух грамадстваў. Сімвал вершніка, вядомы ў літоўскай традыцыі як Vytis, а ў беларускай як Пагоня, узыходзіць да геральдыкі Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ). Пасля аднаўлення незалежнасці Літва ў 1990 годзе зноў замацавала Vytis у якасці дзяржаўнага герба, і гэты статус захоўваецца па сёння. У Беларусі Пагоня таксама была адноўлена як дзяржаўны сімвал пасля набыцця незалежнасці і выкарыстоўвалася ў 1991–1995 гадах, пасля чаго была заменена іншым дзяржаўным гербам. Такім чынам, агульны гістарычны сімвал заняў рознае месца ў сучасных нацыянальных сімвалічных сістэмах дзвюх дзяржаў.

У межах даследавання ўдзельнікам было зададзена пытанне пра магчымае вяртанне Пагоні ў якасці дзяржаўнага сімвала Беларусі: "Як бы вы паставіліся да таго, калі б герб, заснаваны на сімвале Вялікага Княства Літоўскага Пагоня (Vytis), зноў стаў дзяржаўным сімвалам Беларусі, як гэта было ў 1991–1995 гадах?" Толькі 3,4% адназначна станоўча ацэньваюць магчымае вяртанне Пагоні ў якасці дзяржаўнага сімвала Беларусі, яшчэ 15,9% ставяцца да гэтага хутчэй станоўча. У той жа час 32,1% ацэньваюць такую перспектыву негатыўна, а 15% — хутчэй негатыўна. Для 16,4% апытаных гэтае пытанне не мае значэння, яшчэ 17,1% не змаглі адказаць.

Пры складанні доляў пазітыўных і негатыўных ацэнак пераважае больш негатыўная ацэнка. Каля паловы (47,1%) не падтрымліваюць вяртанне сімвала, тады як станоўча да гэтага ставяцца 19,3%. Яшчэ траціна апытаных займае нейтральную або няпэўную пазіцыю.

Больш спрыяльнае стаўленне да магчымага вяртання Пагоні ў якасці дзяржаўнага сімвала Беларусі назіраецца сярод мужчын — 24,1%, а сярод жанчын — 15,3%. Крытычна настроены рэспандэнты з вышэйшай адукацыяй (52,2%) і жыхары

Вільнюса (53%). У той жа час вяртанне герба падтрымліваюць 28,5% тых, хто мае асабістыя кантакты з Беларуссю, супраць 18,1% сярод тых, хто іх не мае.

У Польшчы стаўленне да магчымага вяртання Пагоні менш негатыўнае: 36,3% ставяцца негатыўна, тады як 45% ставяцца нейтральна. Станоўчыя ацэнкі ў абедзвюх краінах застаюцца блізкімі — 18,7% у Польшчы (19,3% у Літве).

Такім чынам, агульная гістарычная спадчына ВКЛ у сімвалічным вымярэнні застаецца для літоўскага грамадства адчувальнай тэмай.

У працяг гістарычнага блока рэспандэнтам было зададзена пытанне пра тое, каму належыць палітычная і культурная спадчына Вялікага Княства Літоўскага. Больш за траціна апытаных (34,4%) лічыць яе агульнай спадчынай усіх народаў, якія пражывалі на тэрыторыі ВКЛ. У той жа час 25,8% звязваюць гэтую спадчыну выключна з літоўскім народам. Значна радзей рэспандэнты называюць яе агульнай спадчынай літоўцаў і палякаў (9,2%) або літоўцаў і беларусаў (3,6%). Яшчэ 6,2% не пагадзіліся ні з адным з прапанаваных сцвярджэнняў, а 20,7% не змаглі адказаць.

Каму належыць палітычная і культурная спадчына

ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА

Доля рэспандэнтаў, %

	Літва	Польшча
Выключна літоўская / польская	25,8	45,9
Літоўская / польская і беларуская	3,6	4,4
Літоўская і польская	9,2	6,9
Усіх народаў, якія жылі на гэтай тэрыторыі	34,4	28,3
Ніводзін з гэтых варыянтаў	6,2	4,6
Цяжка адказаць	20,7	9,9

Літва: Вялікае Княства Літоўскае. Польшча: Рэч Паспалітая.

Іл. 10. Каму належыць палітычная і культурная спадчына

Уяўленне пра палітычную і культурную спадчыну ВКЛ як пра агульную спадчыну ўсіх народаў, якія яго насялялі, з узростам падзяляецца ўсё часцей. Сярод рэспандэнтаў ва ўзросце 18–25 гадоў яго падзяляюць 22,2%, і гэты паказчык паступова павышаецца, дасягаючы 44,1% сярод рэспандэнтаў, старэйшых за 56 гадоў. Такая пазіцыя таксама часцей сустракаецца сярод людзей з вышэйшай адукацыяй (40,1%), а з сярэдняй або нясканчанай — 31,3% і 26,2%. Падобная тэндэнцыя назіраецца і паводле ўзроўню эканамічнага дабрабыту, бо доля

прыхільнікаў агульнай прыналежнасці ВКЛ складае 30,4% у групе з даходам да 500 еўра і 44,7% сярод тых, хто атрымлівае больш за 1500 еўра.

Такім чынам, найбольш распаўсюджаным у літоўскім грамадстве з'яўляецца шматнацыянальнае разуменне спадчыны ВКЛ, хоць адначасова захоўваецца значная група, якая разглядае яе перш за ўсё як частку літоўскай нацыянальнай спадчыны.

У той жа час польскія вынікі дэманструюць іншую структуру гістарычнага ўспрымання: 45,9% рэспандэнтаў лічаць спадчыну Рэчы Паспалітай выключна польскай, тады як шматнацыянальную трактоўку падтрымліваюць 28,3%. Такім чынам, у літоўскім выпадку ўніверсальная, шматнацыянальная інтэрпрэтацыя распаўсюджана крыху шырэй, а выключна нацыянальная — прыкметна радзей.

Дыскусіі пра "літвінізм" у літоўскім грамадстве. У літоўскім публічным і інстытуцыянальным дыскурсе ўжыванне тэрміна "літвінізм" звычайна выкарыстоўваецца ў дачыненні да радыкальных гістарычных інтэрпрэтацый мінулага Вялікага Княства Літоўскага, у якіх аспрэчваецца балцкае паходжанне літоўскай дзяржаўнасці і, у найбольш радыкальных версіях, правы сучаснай Літвы на Вільнюс.[9] Тым не менш у экспертных дыскусіях падкрэсліваецца неабходнасць адрозніваць такія радыкальныя ўяўленні ад больш шырокай цікавасці беларусаў да спадчыны ВКЛ і яе ролі ў беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці.[10]

У апошнія гады гэтая тэма стала больш прыкметнай у літоўскай публічнай прасторы. У Вільнюсе сталі з'яўляцца правакацыйныя плакаты і надпісы з лозунгамі "Вільня наша" і "Litvinai ateina". Аднак падобныя інцыдэнты нельга разглядаць як праяву поглядаў беларускай дыяспары, бо Дзяржаўны дэпартамент бяспекі Літвы пасля паведамiў, што частка такіх правакацый выкарыстоўвалася расійскімі і беларускімі спецслужбамі для распальвання напружанасці паміж літоўскім грамадствам і беларусамі, якія пражываюць у краіне.[11]

Нягледзячы на прыкметнасць тэмы ў палітычнай і медыйнай прасторы, большасць рэспандэнтаў (54,8%) паведамілі, што не чулі пра дыскусіі вакол "літвінізму". Знаёмыя з імі 29% апытаных, а 16,2% не змаглі вызначыцца з адказам.

---

[9] Defence Intelligence and Security Service under the Ministry of National Defence and State Security Department of the Republic of Lithuania, National Threat Assessment 2024 (Vilnius, 2024), 17, https://www.vsd.lt/wp-content/uploads/2024/03/GR-2024-02-15-EN.pdf

[10] Seimas of the Republic of Lithuania, "Apskritojo stalo diskusijoje aptarta Lietuvos ir Baltarusijos istorija ir atminties politika," October 25, 2023, https://www.lrs.lt/sip/portal.show?p_r=35403&p_k=1&p_t=286506

[11] State Security Department of the Republic of Lithuania, "Priešiškos žvalgybos tarnybos bando organizuoti smurtinius išpuolius prieš Lietuvoje gyvenančius baltarusius," April 23, 2025, https://www.vsd.lt/2025/04/23/priesiskos-zvalgybos-tarnybos-bando-organizuoti-smurtinius-ispuolius-pries-lietuvoje-gyvenancius-baltarusius/

Такім чынам, гаворка ідзе хутчэй аб прыкметнай, але не масава вядомай грамадскай дыскусіі. Нягледзячы на тое, што Вільнюс з'яўляецца цэнтрам дыскурсу, каля паловы (45,2%) рэспандэнтаў, якія пражываюць у літоўскай сталіцы, не чулі пра "літвінізм".

Ступень пагрозы і праблемы "літвінізму" для Літвы. Сярод рэспандэнтаў, якія раней паведамілі, што чулі пра дыскусіі вакол "літвінізму", была дадаткова вымерана ступень успрымання пагрозы для Літвы па шкале ад 1 да 10.[12] Сярэдні ўзровень успрыманай пагрозы склаў 5,93 бала. Найбольш распаўсюджанай стала ацэнка ў 7–8 балаў — яе выбралі 30,5% апытаных. Яшчэ 18% ацанілі пагрозу ў 9–10 балаў. У той жа час 21,7% практычна не бачаць пагрозы, выбраўшы 1–2 балы. Прамежкавую ацэнку 5–6 балаў далі 10,5%, а 17,6% не змаглі вызначыцца з адказам.



Іл. 11. Ступень пагрозы «літвінізму» для Літвы

Сацыяльна-дэмаграфічныя адрозненні часцей звязаныя з адукацыяй і месцам пражывання. Сярод рэспандэнтаў з вышэйшай адукацыяй 58,1% ацэньваюць пагрозу ў 7–10 балаў, тады як сярод тых, хто мае сярэднюю адукацыю, такіх 39,9%. Падобныя ацэнкі значна часцей сустракаюцца сярод жыхароў Вільнюса (61,4%) і іншых буйных гарадоў (59,7%), чым сярод жыхароў раённых цэнтраў (33,9%) і сельскай мясцовасці (36%).

Такім чынам, сярод тых, хто знаёмы з дыскусіяй пра "літвінізм", пераважае ўспрыманне яе як дастаткова сур'ёзнай праблемы (7–8 балаў), аднак грамадскага кансэнсусу ў гэтым пытанні няма. Тым не менш практычна кожны пяты ўдзельнік апытання практычна не бачыць у "літвінізме" пагрозы для Літвы.


Пазнавальнасць беларускіх дзеячаў культуры. Апошняе пытанне датычылася дасведчанасці літоўцаў аб аспектах беларускай культуры, у межах якога рэспандэнтам быў прапанаваны спіс дзеячаў, звязаных з рознымі гістарычнымі

[12] Ацэнка праводзілася па шкале ад 1 да 10, дзе 1 азначае поўную адсутнасць пагрозы, а 10 — максімальна высокі ўзровень пагрозы.

перыядамі: агульнай спадчынай больш ранняй гісторыі, літаратурай XIX–XX стагоддзяў і сучаснай культурай.[13]

Вынікі даследавання ў цэлым паказваюць нізкі ўзровень пазнавальнасці беларускіх культурных і гістарычных дзеячаў у літоўскім грамадстве. Больш за палову (52,6%) апытаных не ведаюць ніводнага з прапанаваных дзеячаў, яшчэ 4,5% не змаглі адказаць.

Найбольш пазнавальнымі выявіліся Кастусь Каліноўскі (яго ведаюць 25,8% рэспандэнтаў), Янка Купала (25,2%) і Францыск Скарына (20,9%). Пазнавальнасць усіх астатніх палітычных і культурных дзеячаў, уключаных у спіс, вар'іруецца ад 1,3% да 13,3%.



Іл. 12. Пазнавальнасць беларускіх культурных і гістарычных дзеячаў

Узрост рэспандэнтаў з'яўляецца галоўным паказчыкам, бо сярод рэспандэнтаў у групах 18–25 і 26–35 гадоў ніводнага з прапанаваных імёнаў не ведаюць адпаведна 66,7% і 67,2% апытаных, тады як сярод рэспандэнтаў, старэйшых за 56 гадоў, гэтая доля зніжаецца да 31,7%. У старэйшай узроставай групе асабліва добра вядомыя Янка Купала (48,6%), Кастусь Каліноўскі (41%) і Францыск Скарына

[13] Заўвага: рэспандэнты маглі выбраць некалькі варыянтаў адказу, таму сума працэнтаў перавышае 100%.

(36,5%). У той жа час сярод рэспандэнтаў з вышэйшай адукацыяй ніводнага з прапанаваных дзеячаў не ведаюць 45,3%, а сярод тых, хто мае сярэднюю адукацыю, такіх 56,9%. Асабліва прыкметны разрыў у пазнавальнасці Францыска Скарыны (31,7% супраць 14,8%) і Кастуся Каліноўскага (35% супраць 20,2%). Высокая дасведчанасць характэрная і для жыхароў Вільнюса, бо ніводнага з пералічаных дзеячаў не ведаюць 41,5% рэспандэнтаў, тады як у астатніх тыпах населеных пунктаў гэты паказчык перавышае палову. У сталіцы таксама вышэйшая пазнавальнасць Скарыны (35%), Каліноўскага (37,3%), Купалы (31,8%) і Святланы Алексіевіч (18,4%). Важна адзначыць сувязь у залежнасці ад эканамічнага дабрабыту. Доля тых, хто не ведае ніводнага з прапанаваных імёнаў, зніжаецца з 58,4% сярод рэспандэнтаў з даходам да 500 еўра да 47,9% у групе з даходам больш за 1500 еўра. Нарэшце, больш высокую пазнавальнасць беларускія дзеячы маюць для рэспандэнтаў, якія маюць асабістыя сувязі з Беларуссю: сярод іх ніводнага з пералічаных дзеячаў не ведаюць 42,1%, у параўнанні з 54,1% сярод тых, хто такіх кантактаў не мае.

Такім чынам, веданне беларускіх культурных і гістарычных дзеячаў у літоўскім грамадстве застаецца дастаткова абмежаваным. Значная доля рэспандэнтаў не ведаюць ніводнага з прапанаваных імёнаў, а пазнавальнасць канцэнтруецца толькі вакол некалькіх найбольш вядомых постацяў. Высокія паказчыкі Кастуся Каліноўскага, Янкі Купалы і Францыска Скарыны, пэўна, адлюстроўваюць цесную гістарычную памяць, звязаную з гісторыяй Літвы. Скарына непасрэдна звязаны з Вільнюсам, дзе ён арганізаваў кнігадрукаванне, а Каліноўскі з'яўляецца адной з ключавых постацяў паўстання 1863–1864 гадоў і агульнай гістарычнай памяці народаў Вялікага Княства Літоўскага. У той жа час нізкая пазнавальнасць большасці іншых прапанаваных імёнаў сведчыць пра параўнальна слабае знаёмства літоўскага грамадства з беларускай культурай па-за межамі найбольш вядомых гістарычных постацяў.

У рэгіянальным кантэксце літоўскія рэспандэнты дэманструюць лепшы паказчык знаёмства з беларускімі культурнымі і гістарычнымі дзеячамі. У Польшчы ніводнага з прапанаваных імёнаў не ведаюць 63,1% і прыблізна 65% ва Украіне (у 2025-м). У той жа час ніводнага з імёнаў, прыведзеных у спісе, не ведаюць 52,6% апытаных літоўцаў.

Такім чынам, нягледзячы на больш прыкметную беларускую культурна-гістарычную прастору сярод літоўскага грамадства, нават тут няведанне ніводнага з прапанаваных дзеячаў застаецца найбольш пашыраным адказам.

Высновы

Вынікі даследавання паказваюць, што стаўленне літоўскага грамадства да Беларусі мае складаную і неадназначную структуру. Тым не менш літоўскае грамадства выразна адрознівае беларускіх грамадзян, дыяспару і беларускую дзяржаву. Стаўленне да саміх беларусаў застаецца пароўну падзеленым паміж станоўчымі і адмоўнымі ацэнкамі, тады як грамадзяне Беларусі, якія пражываюць у Літве, успрымаюцца больш спрыяльна. Яшчэ вышэйшая падтрымка рашэння літоўскіх улад прыняць беларусаў, вымушаных пакінуць краіну пасля падзей 2020 года. Такім чынам, літоўскае грамадства ўмее адрозніваць беларусаў як асобную сацыяльную групу ў кантэксце міждзяржаўных выклікаў, а таксама палітычных і гуманітарных абставін іх прысутнасці ў краіне.

Статус беларусаў у літоўскім грамадстве. Літоўскае грамадства падзелена паміж станоўчым і адмоўным стаўленнем да беларусаў, пры гэтым у параўнанні з іншымі краінамі ацэнкі ў Літве выглядаюць найбольш стрыманымі. Аднак беларусы, якія ўжо пражываюць у Літве, успрымаюцца менш негатыўна. У той жа час асабісты кантакт з грамадзянамі Беларусі павышае спрыяльнае стаўленне як да Беларусі, так і да беларусаў, аднак такія кантакты мае толькі невялікая частка насельніцтва, якая пражывае ў сталіцы.

Эканамічная міграцыя. Працоўная міграцыя застаецца дылемай не толькі для ўрада, але і для насельніцтва, пры гэтым грамадства падзелена паміж прыхільнікамі абмежаванняў і захавання цяперашніх умоў. Аднак эканамічны ўнёсак беларусаў, якія ўжо пражываюць у Літве, ацэньваецца больш спрыяльна, чым далейшае пашырэнне міграцыі. Такім чынам, эканамічны ўнёсак беларусаў ацэньваецца значна больш пазітыўна, чым перспектывы далейшага пашырэння працоўнай міграцыі.

Кантэкст бяспекі. У грамадскім успрыманні праводзіцца мяжа паміж грамадзянамі і дзяржавай. Літоўскія грамадзяне не разглядаюць беларусаў, якія пражываюць у Літве, як непасрэдную пагрозу нацыянальнай бяспецы, у той час як цяперашняя беларуская дзяржава ўспрымаецца насцярожана (6,28 бала ў сярэднім). Пагроза, такім чынам, звязваецца перш за ўсё з палітычным рэжымам і яго знешнепалітычнай арыентацыяй, а не з беларусамі як сацыяльнай групай.

Палітычны вобраз Беларусі. Ацэнкі палітычнай сістэмы і знешнепалітычнага становішча Беларусі складаюцца ў дастаткова цэласную карціну. Беларусь адносяць да аўтарытарных дзяржаў і лічаць, што яе магчымасці праводзіць самастойную замежную палітыку істотна абмежаваныя ўплывам Расіі. Аляксандр

Лукашэнка не ўспрымаецца як легітымны прадстаўнік народнай волі, і пры гэтым Святлану Ціханоўскую ведае значная частка літоўскага грамадства.

Стратэгія Літвы. Грамадства не дэманструе выразнага запыту ні на поўную нармалізацыю адносін з афіцыйным Мінскам, ні выключна на яго ізаляцыю. Найбольш распаўсюджана пазіцыя абмежаванага і прагматычнага ўзаемадзеяння ў тых галінах, дзе гэта адпавядае інтарэсам Літвы. У дачыненні да дэмакратычнай апазіцыі таксама пераважае падтрымка супрацоўніцтва, хоць часцей — у абмежаваных або афіцыйна інстытуцыяналізаваных формах.

Гістарычная памяць. Уяўленні пра агульную гістарычную спадчыну застаюцца складанай тэмай для літоўцаў. Найбольш пашырана разуменне спадчыны Вялікага Княства Літоўскага як той, што належыць усім народам, якія жылі на яго тэрыторыі. У той жа час ідэя вяртання Пагоні ў якасці дзяржаўнага сімвала Беларусі ўспрымаецца хутчэй адмоўна, а дыскусія пра "літвінізм" вядомая меншасці літоўскага грамадства. Веданне беларускай культуры і гісторыі застаецца абмежаваным і ў асноўным канцэнтруецца вакол некалькіх постацяў, цесна звязаных з агульнай гісторыяй рэгіёна.

ДАДАТАК

Вынікі парламенцкіх выбараў 2024 года. У другой палове 2024-га прайшлі выбары ў Сейм Літвы, у ходзе якіх перамогу атрымала літоўская партыя Socialdemokratų, атрымаўшы большасць мандатаў, а другое месца захавала кіроўная партыя Tėvynės sąjungą – Lietuvos Konservatorius і партыя Nemuno aušra.[14]

Паводле атрыманых даных, значная частка палітычных пераваг рэспандэнтаў прыпадае на сацыял-дэмакратычную партыю (17,1%) і кансерватыўную (11,9%). Яшчэ 8,9% выбралі Liberalų sąjūdį, і 8% аддаюць перавагу партыі Nemuno aušra. Demokratų sąjungą "Vardan Lietuvos" атрымаў падтрымку 7,3% апытаных, і Lietuvos valstiečių ir žaliųjų sąjungą — 6,3% рэспандэнтаў. Nacionalinis susivienijimas — 2,2% галасоў, а Lietuvos lenkų rinkimų akciją – Krikščioniškų šeimų sąjungą — 1,8%. Нарэшце, 9,1% выбралі іншую партыю, а 27,4% не галасавалі за палітычную партыю на апошніх парламенцкіх выбарах.

Такім чынам, вынікі апытання адлюстроўваюць дзейную палітычную сілу, якая фарміруе літоўскі ўрад у асобе сацыял-дэмакратаў. Тым не менш каля траціны апытаных не прымалі ўдзелу ў галасаванні, што сведчыць пра грамадска-палітычную апатыю літоўскага грамадства.

[14] Vyriausioji rinkimų komisija, *Rezultatai – 2024 m. Seimo rinkimai*, VRK, https://www.vrk.lt/en/2024-seimo/rezultatai?srcUrl=/rinkimai/1544/2/2148/rezultatai/en/rezultataiIsrinktiNariai.html

Інстытут палітычных даследаванняў «Палітычная сфера»
ПА ДРУГІ БОК МЯЖЫ
Беларусь і беларусы ва ўспрыманні літоўскага грамадства

www.palityka.org

